# Журналістыка

А. Ф. МЯСНІКОЎ

## ВЫКАРЫСТАННЕ КАМПАРТЫЯЙ БЕЛАРУСІ ДРУКУ Ў ЯКАСЦІ АРГАНІЗАТАРА, КІРАЎНІКА І ПРАПАГАНДЫСТА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА Ў 70-я ГАДЫ

У Пастанове Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза «Аб далейшым паляпшэнні арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва» [1] падкрэслена, што працоўнае саперніцтва было і застаецца эфектыўным метадам уздыму прадукцыйных сіл, удасканалення вытворчых адносін, выхавання працоўных, прыцягнення іх да кіраўніцтва вытворчасцю, магутным сродкам развіцця творчай ініцыятывы мас, фарміравання сацыялістычнага калектывізму. Народжаныя ў шырокіх масах працоўных у ходзе спаборніцтва працоўны энтузіязм, творчы падыход да справы, наватарства праз сродкі масавай інфармацыі і прапаганды становяцца здабыткам мільёнаў людзей, усяго савецкага народа.

Прынцыпы арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ў сацыялістычным грамадстве агульныя і спецыфічныя. Агульныя — гэта дэмакратычны цэнтралізм, спалучэнне матэрыяльнага і маральнага стымулявання, развіццё грамадскай актыўнасці мас. Да спецыфічных Уладзімір Ільіч Ленін адносіў публічнасць, параўнальнасць вынікаў, магчымасць практычнага паўтарэння вопыту. Аднак усе яны знаходзяцца ў дыялектычным адзінстве. І не выпадкова сродкі масавай інфармацыі і прапаганды, і ў першую чаргу друк, пастаянна падкрэсліваюць гэтае адзінства, выкарыстоўваюць комплексны падыход да распрацоўкі тэорыі і асвятлення практычнай работы па развіццю і ўдасканаленню працоўнага саперніцтва.

XXIV з'езд КПСС патрабаваў, каб развіццё сацыялістычнага спаборніцтва як дзейснага метада эканамічнага будаўніцтва, умацавання сацыялістычных адносін паміж людзьмі было прадметам пастаяннай увагі партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый. Асноўным жа зместам спаборніцтва, важнай умовай сацыялістычнага гаспадарання ў сямідзесятыя гады стала мэтанакіраваная барацьба за высокую эфектыўнасць вытворчасці на аснове няўхільнага росту прадукцыйнасці працы і паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу.

У жніўні 1974 года ЦК КПСС прыняў Пастанову «Аб рабоце па падбору і выхаванню ідэалагічных кадраў у партыйнай арганізацыі Беларусі», у якой, у прыватнасці, адзначана, што КПБ «умела накіроўвае намаганні ідэалагічных кадраў на развіццё палітычнай актыўнасці і працоўнай ініцыятывы рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі, на шырокае разгортванне сацыялістычнага спаборніцтва, паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, паспяховае выкананне заданняў пяцігодкі» [2]. Такая высокая ацэнка практычнай работы партыйных кіраўнікоў і актывістаў рэспублікі натхняла іх на павелічэнне актыўнасці, на пашырэнне і паглыбленне ўздзеяння на працоўныя масы.

Сваю практычную работу ў масах Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі, абласныя, гарадскія, раённыя і пярвічныя партыйныя арганізацыі вядуць шырокім фронтам, выкарыстоўваючы для гэтага самыя розныя формы і метады. Аднак самай вялікай трыбунай публічнасці працоўнага саперніцтва стаў друк — калектыўны прапагандыст, агітатар і арганізатар мас.

Штогод толькі ў «Звяздзе» выступаюць звыш 150 партыйных кіраў-

нікоў і работнікаў. Па сутнасці, у кожным з гэтых артыкулаў вядзецца размова аб удасканаленні вытворчасці, ажыццяўленні рэжыму эканоміі, барацьбе за эфектыўнасць і якасць, зніжэнне сабекошту прадукцыі, развіцці рацыяналізацыі і вынаходніцтва... На вырашэнне гэтых задач была накіравана ў сямідзесятыя гады ўся практычная дзейнасць Кампартыі рэспублікі, і парасткі новага, перадавога, якія з'яўляліся, нараджаліся, у тым ці іншым калектыве, станавіліся праз друк здабыткам усіх працоўных Беларусі. Пафас новага ў камуністычным будаўніцтве, прыклады ініцыятараў вытворчасці, таварыская ўзаемадапамога, якія нараджаліся ў ходзе сацыялістычнага спаборніцтва, клікалі і вялі тысячы працаўнікоў наперад, на штурм новых вышынь.

Шматгранная работа партыйных камітэтаў рэспублікі значна садзейнічала згуртаванню працоўных калектываў, забяспечвала рост свядомасці працоўных, паляпшэнне ўсёй работы па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Разам з развіццём працоўнай і грамадскай актыўнасці рабочых, калгаснікаў, служачых Камуністычная партыя Беларусі ўзмацняла і кіраўніцтва Саветамі, прафсаюзамі, камсамолам, іншымі грамадскімі арганізацыямі. Менавіта праз іх партыйныя органы і арганізацыі ўзмацнялі сувязь з масамі, аказвалі на іх сваё ўздзеянне, мабілізоўвалі на выкананне і перавыкананне дзяржаўных заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў.

З цікавым і надзвычай павучальным артыкулам «Не кожны першы — перадавік» выступіў у «Звяздзе» першы сакратар Мазырскага гаркома КПБ В. Папоў. «Гарком КПБ, — пісаў ён, — уважліва адносіцца да практыкі партыйных арганізацый у кіраўніцтве спаборніцтвам, пастаянна клапоціцца аб удасканаленні яго форм і дзейснасці. Патрабуючы ўдумлівага падагульнення вынікаў, дакладнага ўліку зробленага і адпаведнага заслугам узнагароджання, галоўны ўпор робім на маральны фактар спаборніцтва. Такія пытанні пастаянна ў парадку дня пасяджэнняў бюро і пленумаў гаркома партыі. Яны ў цэнтры лекцыйнай прапаганды, вуснай і нагляднай агітацыі. Іх рэгулярна абмяркоўваюць партыйныя арганізацыі. Уважліва падыходзім да тых, хто жыве вузкавытворчым прынцыпам, не прыняўся яшчэ клопатам аб агульнай справе. Мы зыходзім з ленінскага вызначэння, што сацыялізм стварае магчымасць уцягнуць сапраўды большасць працоўных на арэну такой работы, дзе яны могуць праявіць сябе, разгарнуць свае здольнасці, паказаць таленты, якіх у народзе — невычэрпная крыніца» [3]. Аргументавана, цесна спалучаючы ленінскую тэорыю з практычнай работай, паказвае кіраўнік гарадской партыйнай арганізацыі шляхі і метады ўздзеяння на шырокія працоўныя масы. У гэтай дзейнасці няма дробязей, партыйна-выхаваўчая работа павінна мець няспынны, наступальны характар, яна павінна распаўсюджвацца на кожнага чалавека.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі сваёй галоўнай задачай у сямідзесятыя гады бачыў забеспячэнне росту актыўнасці і арганізаванасці рабочага класа і калгаснага сялянства. А вялася гэта работа праз сродкі масавай інфармацыі і прапаганды — друк, тэлебачанне, радыёвяшчанне. Арыенцірам для творчых супрацоўнікаў газет у гэты перыяд сталі словы Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева, сказаныя ім з трыбуны XVIII з'езда ВЛКСМ: «Час усім работнікам ідэалагічнага фронту пакончыць з нязжытай яшчэ дзе-нідзе практыкай механічнага, бяздумнага паўтарэння прапісных ісцін, са славеснай траскатнёй. Час зрабіць правілам — размаўляць з людзьмі простай і даходлівай мовай, пісаць, укладваючы ў кожны выраз жывую думку і пачуцці» [4].

У публікацыях «Звязды» і «Советской Белоруссии», «Сельской газеты» і «Мінскай праўды» у гэты час пераважалі дзелавыя, сур'ёзныя, даходлівай мовай напісаныя артыкулы, карэспандэнцыі, замалёўкі. З асаблівым стараннем, творча падыходзілі журналісты да падрыхтоўкі да друку выступленняў перадавікоў і наватараў вытворчасці. Так, з дзелавым пастановачным артыкулам «Наватару патрэбны паслядоўнікі» у «Советской Белоруссии» выступіў стругальшчык Мінскага вытворчага аб'яднання па выпуску аўтаматычных ліній імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка Л. І. Патаповіч. «Гаворачы аб шырокай прапагандзе, распаўсюджванні перадавога вопыту, — падкрэслівае ён, — нельга не сказаць і аб той важнейшай ролі, якая адводзіцца органам масавай інфармацыі. Яны павінны жыва і даходліва паказваць і прапагандаваць лепшыя да-

сягненні, перадавы вопыт асобных працаўнікоў, цэлых калектываў. Галоўнае тут, вядома, раскрыць сутнасць гэтага вопыту, зацікавіць ім мільёны людзей, дапамагчы шырока ўкараніць яго. Так ставіць задачу Пастанова ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы». Не заўсёды, аднак, так атрымліваецца на практыцы,— працягвае Л. І. Патаповіч.— Ёсць у гэтым і віна наватараў, рабкораў. Часта ў сваіх артыкулах, выступленнях па радыё і тэлебачанню мы больш выхваляемся, чым па-дзелавому раскрываем прынцып барацьбы за ўкараненне новага, прагрэсіўнага» [5].

Заклапочана, з дзяржаўных пазіцый гаворыць вядомы ў нашай рэспубліцы радавы працаўнік пра набалелае, тое, што хвалюе і непакоіць яго ўжо не адзін год. Яго думкі і выказванні — гэта канкрэтная праграма для кіраўнікоў і партыйных работнікаў самага высокага рангу, тых, хто заклікаНы арганізоўваць і кіраваць не толькі ходам працоўнага саперніцтва, але і ўсім працэсам развіцця сацыялістычнай эканомікі.

Кожнае слова, сказанае з газетных старонак, павінна знаходзіць шырокі водгук у сэрцах чытачоў, адбівацца ў іх свядомасці, усёй практычнай дзейнасці. У газетнай практыцы вельмі важна не проста фіксаваць становішча спраў, а трэба прадбачыць, падказваць далейшае развіццё іх. Аднак публікацыі маладзёжных газет «Чырвоная змена» і «Знамя юности» нярэдка вызначаюцца недастатковай, неглыбокай аргументацыяй. Што ж датычыцца газет «Звязда», «Советская Белоруссия», то на іх старонках вельмі рэдка публікуюцца артыкулы аб тым, як пярвічныя партыйныя арганізацыі ажыццяўляюць кантроль за дзейнасцю кіраўніцтва вытворчасцю.

Ва ўсіх сферах дзейнасці ў сямідзесятыя гады адбыўся паварот да якасных паказчыкаў. І гэта, несумненна, павінна яшчэ больш падахвочваць партыйныя камітэты звяртаць самую пільную ўвагу на ўзровень крытыкі і самакрытыкі ў газеце, на свае адносіны да друкаванага слова. Эфектыўнасць партыйнага кіраўніцтва друкам ў многім залежыць ад таго, наколькі аператыўна і глыбока зможа адпаведны партыйны камітэт прааналізаваць грамадскую значымасць пачына ці ініцыятывы працоўных, распаўсюдзіць яго, нацэліць журналісцкі калектыў на дасягненне гэтай справы да лагічнага завяршэння. Для таго, каб павысіць гэту эфектыўнасць, Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі ў 1979 годзе правёў размеркаванне сфер уплыву газет. Цяпер «Звязда», напрыклад, заклікана адлюстроўваць і сканцэнтроўваць сваю ўвагу на арганізацыйна-партыйнай рабоце, на дзейнасці партыйных камітэтаў па развіццю сельскагаспадарчай вытворчасці, культуры, навукі і г. д. «Советская Белоруссия» ж сарыентавана на прапаганду і пашырэнне перадавога вопыту ў прамысловасці рэспублікі, гандлі, бытавым абслугоўванні насельніцтва... У выніку ўсё радзей на старонках газет сустракаецца дубліраванне, перапеў тэм. Размеркаванне сфер уплыву газет, несумненна, акажа карысць і ў іншым напрамку. Журналісцкія калектывы хутчэй пераадолеюць дробнатэм'е, раскіданасць, газетчыкі больш сканцэнтруюць свае сілы на вырашэнні тых задач, праблем і напрамкаў, якія вызначаны для іх Цэнтральным Камітэтам Кампартыі рэспублікі.

[1] Правда, 1971, 5 сентября.
[2] Звязда, 1974, 31 жніўня.
[3] Звязда, 1978, 20 верасня.
[4] Правда, 1978, 26 апреля.
[5] Советская Белоруссия, 1979, 12 июля.

Я. Р. РАДКЕВІЧ

## ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ І СТРУКТУРА БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁ

Беларускае радыёвяшчанне бярэ вытокі, як і ўсё савецкае радыёвяшчанне, з першых дэкрэтаў Савецкай улады аб радыёсправе, з той пільнай, неаслабнай увагі, якую надаваў ёй У. І. Ленін. Неўзабаве пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі голас Масквы, голас ленінскай праўды далягацеў да аддаленых месцаў нашай Радзімы. Пачулі яго і ў Беларусі.

Як вядома, 15 лістапада 1925 года ў Мінску сабралася грамадскасць беларускай сталіцы, каб адзначыць важную падзею ў культурным жыцці рэспублікі. У гэты дзень адкрывалася першая ў рэспубліцы